PATVIRTINTA
Nacionalinės švietimo agentūros direktoriaus
2024 m. d. įsakymu Nr.

**2023–2024 M. M. BALTARUSIŲ TAUTINĖS MAŽUMOS GIMTOSIOS KALBOS IR LITERATŪROS TARPINIO PATIKRINIMO ELEKTRONINĖS UŽDUOTIES MOKINIŲ DARBŲ VERTINIMO INSTRUKCIJOS PROJEKTAS**

<table>
<tr><th>Klausimo Nr.</th><th>Atsakymas</th><th>Vertinimo kriterijai</th><th>Taškai</th></tr>
<tr><td colspan="4">I DALIS<br>KLAUSOMO TEKSTO SUPRATIMAS (8 TAŠKAI)</td></tr>
<tr><td>1</td><td>Іх персанажы не пераходзяць з адной кнігі ў другую.<br><br>Падзеі адбываюцца ў розныя гістарычныя эпохі.</td><td>За 2 правільныя адказы.</td><td>1</td></tr>
<tr><td>2</td><td>Усе яны напісаны на гістарычную тэму.<br>У кожным творы галоўны персанаж – рэальная гістарычная асоба.</td><td>За 2 правільныя адказы.</td><td>1</td></tr>
<tr><td>3</td><td>“Меч князя Вячкі” – XIII ст., барацьба з крыжакамі.<br>“Жалезныя жалуды” – падзеі адбываюцца ў часы зараджэння ВКЛ.<br>“След Ваўкалака” – у аснове сюжэта рамана ляжаць падзеі 1067 года.</td><td>За 3 правільныя адказы 2 балы.<br><br>За 2 правільныя адказы 1 бал.</td><td>2</td></tr>
<tr><td>4</td><td><table><tr><th></th><th>Факт</th><th>Меркаванне</th></tr><tr><td>У цэнтры ўсіх трох раманаў знаходзіцца фігура ўладара.</td><td>+</td><td></td></tr><tr><td>Ніхто не можа ведаць, што ён зробіць на</td><td></td><td>+</td></tr></table></td><td>За 5-6 правільных адказаў 3 балы.<br><br>За 3-4 правільныя адказы 2 балы.<br><br>За 2 правільныя</td><td>3</td></tr>
</table>

<table>
<tr><td></td><td></td><td>месцы іншага.</td><td></td><td></td><td rowspan="5">адказы 1 бал.</td><td rowspan="5"></td></tr>
<tr><td></td><td></td><td>Мастацкі вымысел – гэта адметнасць мастацкага твора.</td><td>+</td><td></td></tr>
<tr><td></td><td></td><td>Важна перамагчы ў барацьбе не фізічна, а духоўна.</td><td></td><td>+</td></tr>
<tr><td></td><td></td><td>Вячка (...), Усяслаў Чарадзей, Войшалак – рэальныя гістарычныя асобы.</td><td>+</td><td></td></tr>
<tr><td></td><td></td><td>Гэта немагчымае параўнанне: любоў да дзіцяці і любоў да Радзімы</td><td></td><td>+</td></tr>
<tr><td>5</td><td colspan="4">У творах шмат лірычных уставак.<br>У творах прысутнічаюць пейзажныя замалёўкі.</td><td>За 2 правільныя адказы.</td><td>1</td></tr>
<tr><td colspan="7">II DALIS<br>SKAITOMO TEKSTO SUPRATIMAS (16 TAŠKŲ)</td></tr>
<tr><td>6</td><td colspan="4">ідэалістычнае светаўспрыманне пісьменнікам рэчаіснасці.</td><td>За правільны адказ.</td><td>1</td></tr>
<tr><td>7</td><td colspan="4">Імя і прозвішча гэтага персанажа сталі літаратурным псеўданімам аўтара.</td><td>За правільны адказ.</td><td>1</td></tr>
<tr><td>8</td><td colspan="4">Каб Лятальскі пераканаўся, што і сяляне – людзі сумленныя, высакародныя.</td><td>За правільны адказ.</td><td>1</td></tr>
</table>

<table>
<tr><td>9</td><td>Той, хто захапляецца ўсім французскім.</td><td>За правільны адказ.</td><td>1</td></tr>
<tr><td>10</td><td>Аўтар марыць аб тым, каб паны сталі “добрымі бацькамі” для сваіх сялян.</td><td>За правільны адказ.</td><td>1</td></tr>
<tr><td>11</td><td>Паказаў шырокую карціну жыцця прыгоннай вёскі, стварыць каларытныя, самабытныя характары прадстаўнікоў народа.</td><td>За правільны адказ.</td><td>1</td></tr>
<tr><td>12</td><td>Вобразам Навума аўтар адстойваў права на паказ у літаратуры ў якасці галоўнага героя селяніна.</td><td>За правільны адказ.</td><td>1</td></tr>
<tr><td>13</td><td>Сяляне ў п‘есе, у адрозненне ад паноў, размаўляюць па-беларуску.</td><td>За правільны адказ.</td><td>1</td></tr>
<tr><td>14</td><td>Герой так і сыпле прыказкамі і прымаўкамі.</td><td>За правільны адказ.</td><td>1</td></tr>
<tr><td>15</td><td>Сяляне і паны ў рэшце рэшт становяцца добрымі сябрамі.</td><td>За правільны адказ.</td><td>1</td></tr>
<tr><td>16</td><td><table>
<tr><th>Асветніцтва</th><th>Рамантызм</th></tr>
<tr><td>Магчымасць маральнага ўдасканалення і перавыхавання чалавека.</td><td>Сувязь з фальклорам</td></tr>
<tr><td>Дэмакратызацыя героя.</td><td>Ідэалізацыя рэчаіснасці</td></tr>
<tr><td>Услаўленне чалавека як носьбіта разумовых і маральных вартасцей незалежна ад яго паходжання.</td><td>Затушоўванне сацыяльных праблем</td></tr>
</table></td><td>3 балы за 5-6 правільна названых рысы.<br><br>2 балы за 3-4 правільна названыя рысы.<br><br>1 бал за 2 правільна названыя рысы.</td><td>3</td></tr>
<tr><td>17</td><td>Эпітэт.</td><td>За правільны адказ.</td><td>1</td></tr>
</table>

| | | | |
|---|---|---|---|
| 18 | *Стыль*:публіцыстычны.<br>*Асаблівасці стылю*: ацэначная лексіка, мэта – інфармаваць. | 1 бал за правільна вызначаны стыль.<br><br>1 бал за 2 правільна названыя асаблівасці стылю. | 2 |
| **III DALIS<br>TEKSTO KŪRIMAS (16 TAŠKŲ)** | | | |
| 19 | 1. Вершы Пімена Панчанкі, самыя пранізлівыя, самыя адкрытыя, увайшлі ў залаты фонд беларускай паэзіі. 2. Я ўжо навучыўся валодаць сабою, але любое спачуванне таварышаў па палаце адразу ж выбівала мяне з сядла. 3. Сёлета, дзякуй богу, у буслоў было толькі адно бусляня. 4. Не, не можа яна паехаць, не пагаварыўшы з сябрам душа ў душу. 5. Дзённікавая форма вымагае запісаў па гарачых слядах падзей, па свежых уражаннях. | За 5-6 правільных адказаў 3 балы.<br><br>За 3-4 правільныя адказы 2 балы.<br><br>За 2 правільныя адказы 1 бал. | 3 |
| 20 | Зарубіць сабе на носе. Узяць сябе ў рукі. Выбачай мне, дружа, за спазненне на сустрэчу. Як многа значыць — мець не толькі вёску ці горад, дзе табе знаёма кожная вуліца, кожны дом, дзе ты ўсё ведаеш і цябе таксама ўсе ведаюць, але мець яшчэ і сваіх людзей, адчуць, адкуль бы ты ні вярнуўся, яны цябе прымуць, памогуць. Трэба зрабіць самому. Паведаміць самаму вялікаму начальніку. | За 6-8 правільных адказаў 2 балы.<br><br>За 5 правільных адказаў 1 бал. | 2 |
| 21 | Даходлівае тлумачэнне; даходнае месца. Дробны пясок; дробавы лічэбнік. Класічны твор; класны сход.<br>Лясная ягада; лясістая мясцовасць. | За 6-8 правільных адказаў 2 балы.<br><br>За 5 правільных | 2 |

<table>
<tr><td></td><td></td><td>адказаў 1 бал.</td><td></td></tr>
<tr><td>22</td><td>Мінаючы вёску за вёскай, трапляліся нам рэдкія падарожныя.<br>Праехаўшы лес, у мяне ўзнікла думка звярнуць з дарогі.<br>Пралятаючы над горадам, у самалёта раптам забарахліў матор.<br>Гледзячы ў акно, у мяне закружылася галава.<br>Перачытваючы раман, у мяне ўзнікла нечаканая ідэя.<br>Закончыўшы школу, у Антося ўзнікла жаданне вучыцца далей.</td><td>За 5-6 правільных адказаў 2 балы.<br>За 4 правільныя адказы 1 бал.</td><td>2</td></tr>
<tr><td>23</td><td>Разважанне – тып маўлення, у якім раскрываюцца прычыны чаго-небудзь, абгрунтоўваецца пэўная думка, тлумачыцца што-небудзь і г.д. Разважанне патрабуе лагічнай, дакладнай сістэмы доказаў, аргументаў, якія павінны быць пераканаўчыя. Праз разважанне можна ўздзейнічаць не толькі на розум, але і на пачуцці адрасатаў. Структура тэксту-разважання звычайна наступная: 1) тэзіс; 2) доказы; 3) вывады.</td><td>За 11-12 правільных адказаў 4 балы.<br>За 8-10 правільных адказаў 3 балы.<br>За 5-7 правільных адказаў 2 балы.<br>За 4 правільныя адказы 1 бал.</td><td>4</td></tr>
<tr><td>24</td><td><table><tr><th>Уступ</th><th>Асноўная частка</th><th>Заключэнне</th></tr><tr><td>Сфармуляваць асноўны тэзіс. Абгрунтаваць выбар тэмы.</td><td>Лагічна і аргументавана раскрыць тэму. Спасылацца на розныя крыніцы, каб пацвердзіць уласную пазіцыю.</td><td>Падвесці вынік работы, лагічна завяршыць разважанні над праблемай тэксту.<br>Коратка напісаць пра актуальнасць тэмы.</td></tr></table></td><td>За 5-6 правільных адказаў 3 балы.<br>За 3-4 правільныя адказы 2 балы.<br>За 2 правільныя адказы 1 бал.</td><td>3</td></tr>
</table>

**Iš viso 40 taškų.**

## **Klausomo teksto transkripcija**

Я раскажу вам пра тры кнігі. Гэтыя кнігі складаюць такую ўмоўную трылогію, таму расказваць пра іх асобна я не хачу, мы пагаворым пра тры гістарычныя раманы Леаніда Дайнекі, гэта “Меч Князя Вячкі”, “След ваўкалака” і “Жалезныя жалуды”. Я не гісторык, таму тут, у гэтым выпуску, вы не пачуеце нейкай глыбокай аналітыкі тых ці іншых падзей з нашай гісторыі. Тут будуць выключна агульнапрынятыя гістарычныя факты і цытаты з твораў. Хаця сам Дайнека, калі пісаў свае гістарычныя творы, ён звяртаўся да велізарнай колькасці крыніц, і таксама ён сцвярджаў наступнае: “Той, хто хоча працаваць на ніве беларускай гістарычнай белетрыстыкі, павінен ведаць польскую мову, арыентавацца ў літоўскай, нямецкай і латыні”. Але чаму раней, калі я казала пра трылогію, я дадала туды прыметнік “умоўная”? Рэч у тым, што непасрэдна паміж сабой гэтыя кнігі не звязаны, персанажы там не пераходзяць з кнігі ў кнігу, таму што падзеі ўвогуле адбываюцца ў розныя гістарычныя эпохі. Але тры гэтыя кнігі аб'яднаныя тым, што, дзякуючы ім, перад намі паўстаюць асобыя падзеі нашага мінулага. І ўвогуле, Леанід Дайнека першы ў беларускай прозе пра мінулае стварыў такі гістарычны раманны цыкл. І ўсе гэтыя тры творы расказваюць нам пра розныя часы.

Першы ў нас быў раман “Меч князя Вячкі”, які выйшаў у 1987 годзе. Галоўны герой, як я ўжо казала, гэта князь Вячка, які княжыў у Кукінойскім княстве. Ён, як і большасць герояў гэтага твора, рэальная гістарычная асоба. Нагадаю, што гэта 1200-я гады. У Полацкім княстве ідзе барацьба з крыжакамі. Звесткі пра гэты гістарычны перыяд мы атрымалі з такога літаратурнага помніка, які называецца “Хронікі Лівоніі”. Напісаў яго Генрых Латвійскі ў 1224-27 гадах. Ён быў нямецкім храністам, і ён таксама трапіў у лік герояў гэтай кнігі.

З юнацтва Вячкі мы даведаліся, што ён з самых ранніх гадоў вырашыў служыць народу. І ён стрымлівае сваё слова, як мы ўбачым. У 16 гадоў ён сцвярджае, што да апошняга ўздыху будзе бараніць Айчыну ад чужынцаў. Так і атрымалася, бо ён загінуў на полі бою, але яго меч узяў Якаў Палачанін, ягоны паплечнік, паказаўшы такім чынам, што барацьба працягваецца.

Вячка бачыў, што ў гэтым канфлікце, які ўзнік, іншыя князі пачынаюць высвятляць адносіны паміж сабой. Яны пачынаюць варагаваць, што, зразумела, не ідзе на карысць ім, таксама іх землям, а, наадварот, гэта становіцца спрыяльнай умовай для нападу крыжакоў. Усё ўскладняецца, калі ворагі захопліваюць у палон Соф’ю, дачку Вячкі, каб такім спосабам ціснуць на яго. І тут Вячка вымушаны рабіць выбар паміж бацькоўскім абавязкам і адказнасцю перад краінай, бараніць або сваё дзіця, або свой народ.

Але мне падаецца, што гэта проста немагчымае параўнанне: любоў да дзіцяці і любоў да радзімы. Што яшчэ горш, як мне падаецца, бо ніхто не можа ведаць увогуле, які выбар ён зробіць на месцы іншага. Вось я не буду спойлерыць, што зробіць Вячка, самі пра гэта прачытаеце. Але ў любым выпадку, раман прасякнуты вельмі актуальнай ідэяй пра тое, наколькі важна аб'ядноўвацца перад пагрозамі. Але яшчэ, як мне падаецца, гэтая кніга пра тое, што часам не столькі важна перамагчы ў барацьбе фізічна, колькі важна перамагчы духоўна.

Вы можаце спытаць, наколькі ўвогуле гэты твор можна лічыць праўдзівым з гістарычнага пункту гледжання. І я скажу, што, зразумела, успрымаць “Меч князя Вячкі”, як і ўсе астатнія творы, пра якія мы сёння пагаворым, варта выключна як мастацкі твор. Але, што датычыць сутнасці гістарычных падзей, то мне падаецца, што тут усё выкладзена праўдзіва, але, зноў жа, паўтаруся, я не гісторык. Але, на мой погляд, у фактычнай частцы няма нічога

асабліва выдуманага, ёсць пэўная доля мастацкай выдумкі, якая проста патрэбная для напісання мастацкага твора.

Наступны твор, пра які мы пагаворым, называецца “След ваўкалака”. У XI-ым стагоддзі княжыў у Полацку такі князь як Усяслаў Чарадзей, сын Брачыслава і ўнук Рагнеды. І лічылася, што Усяслаў Чарадзей валодаў чарадзейнай сілай. У аснове сюжэту гэтага рамана ляжаць падзеі 1067 года. У 1065 годзе пачалася бітва паміж Кіевам і Полацкам. Тры браты Яраслававічы, нашчадкі Яраслава Мудрага, павялі свае войскі на Мінск. У 1067 годзе на рацэ Няміга адбылася крывавая бітва. А праз некалькі месяцаў пасля бітвы запрасілі Усяслава на перамовы. Але браты ашукалі Усяслава, і калі ён выехаў да іх на перамовы, яго разам з сынамі Расціславам і Барысам схапілі і адвезлі ў Кіеў, дзе там кінулі ў поруб. Але праз нейкі час жыхары Кіева выпусцілі з турмы Усяслава з сынамі. І мала таго, што яны яго выпусцілі, яны яшчэ пасадзілі яго княжыць у Кіеве і паставілі на чале свайго войска. І не дарэмна, бо пад кіраўніцтвам Усяслава яны змаглі разбіць полаўцаў.

Ну і, нарэшце, пяройдзем да апошняй кнігі нашага гістарычнага цыкла. І гэтая кніга называецца “Жалезныя жалуды”. Падзеі ў гэтым творы разгортваюцца ў часы зараджэння ВКЛ. Гэта пачатак і сярэдзіна XIII-га стагоддзя. І тут у нас зноў жа ў цэнтры аповеду, як і ў папярэдніх раманах, знаходзіцца фігура валадара – рэальнай гістарычнай асобы князя Міндоўга, які стаяў ля вытокаў ВКЛ. Але сярод герояў твора мы сустрэнем мноства іншых рэальных гістарычных асобаў, напрыклад, Войшалка, сына Міндоўга, які таксама прымаў актыўны ўдзел у палітычным жыцці маладой дзяржавы. Але таксама ў прасторы твора мы ўбачым і герояў выдуманых, якія былі не менш неабходныя для таго, каб перадаць атмасферу таго часу.

Зноў жа, як і ў першым творы, усё скіроўваецца да гэтага моманту яднання. Ну і, зноў жа, як і ў папярэдніх творах, у гэтым рамане вельмі шмат лірычных уставак, нейкіх пейзажных замалёвак, і адчуваецца, што Дайнека – ён яшчэ і паэт. Творы Леаніда Дайнекі мне даволі гістарычна дакладнымі падаюцца, але, разам з тым, яны вельмі мастацкія і ў чымсьці нават паэтычныя, як я ўжо сказала. І тры яго раманы, пра якія мы сёння пагаварылі, прасякнутыя паэзіяй у прозе. Тут сустракаецца процьма ўстойлівых выразаў, фразеалагізмаў, народных мудрасцяў і розных трапных параўнанняў. Так што гэтыя творы я магу толькі ахвотна вам парэкамендаваць.

Паводле падкаста Bellit “Гістарычныя раманы Леаніда Дайнекі”. 28.10.2023 (https://podtail.com/ru/podcast/bellit/104/)